✓У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі **9 кастрычніка** пачала працаваць выстаўка **«Trans Atlantic Art Message»**, накіраваная на распаўсюджванне культурнай спадчыны і развіццё адносінаў паміж Беларуссю і Венесуэлай.

Экспазіцыя прысвечаная лідару Баліварыянскай рэвалюцыі камандантэ Уга Рафаэлю Чавесу Фрыясу і яго ўнёску ў развіццё брацкіх адносінаў Венесуэлы і Беларусі, пераасэнсаваным і паказаным праз прызму творчасці сусветна вядомага беларускага мастака, ўдзельніка шматлікіх выставачных праектаў Беларусі і замежжа Алеся Родзіна.

Арганізатары выстаўкі – Пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.